# Акцыя «Наш паклон вам, ветэраны!» праходзіць у Ашмянскім раёне

Хутка бяжыць час. Далёкім рэхам адгукаюцца ў сэрцах землякоў падзеі ваеннага ліхалецця.

Напярэдадні Дня Перамогі, 4 мая 2019 года спецыялісты ДУ "Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна" разам з дырэктарам Ліліяй Невяркевіч працягнулі святочную акцыю "Наш паклон вам, ветэраны!". Да іх далучыліся актывісты БРСМ і навучэнцы Ашмянскай школы мастацтваў, а таксама наведвальнікі аддзяленняў Цэнтра. Вялікай і дружнай кампаніяй яны прыйшлі ў госці да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і асобам, пацярпелым ад наступстваў вайны. Шмат цёплых слоў віншаванняў з надыходзячым святам, слоў удзячнасці за мірнае жыццё, пажаданняў моцнага здароўя прагучала для іх у гэты дзень. Былі ўручаны падарункі ад Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта, прадастаўленыя прадпрыемствамі раёна.







